9. Зубачевский, В.А. Геополитические планы Германии, Польши, Советской России в период польско-советской войны 1920 года // Славяноведение. - 1999. – №4. – С. 41-49.

10. Из истории Гражданской войны в СССР. Сб. док. и мат. 1918-1922: В 3 т. Т.3: февраль 1920 – октябрь 1922. М.: Советская Россия, 1961. – 875 с.

11. Корнеев, В.Е. Личный фонд Б.В. Савинкова в Международном институте социальной истории в Амстердаме //Отечественная история. – 1998. - № 3. – С. 148–150.

12. Ленин, В.И. Неизвестные документы. 1891-1922. /В.И. Ленин. – М.: Росспэн, 1999. – 670 с.

13. Михайловский, Г.Н. Записки. Из истории российского внешнеполитического ведомства, 1914-1920 гг. В 2-х кн. – Кн. 2. Октябрь 1917 г. – ноябрь 1920 г. – М.: Междунар. отношения, 1993. – 686 с.

14. Михутина, И.В. Польско-советская война 1919-1920 гг. / Ин-т славяноведения и балканистики РАН, 1994. – 323 с.

15. Назаров, М.В. Тайна России. - М.: Альм. «Рус. идея», 1999. – 732 с.

16. Ольшанский, П.Н. Рижский мир /АН СССР; Ин-т славяноведения и балканистики. - М.: Наука, 1969. – 260 с.

17. Польша в XX веке. Очерки политической истории. Отв. ред. А.Ф. Носкова. – М.: 2012. – 952 с.

18. Симонова Т. «Помнят польские паны…» //Родина. – 2021. – №3. – С. 126–129.

19. Шмелев, А.В. Внешняя политика правительства адмирала Колчака (1918–1919 гг.) /А. Шмелев. – СПб: Изд-во Европейского ун-та в Санкт-Петербурге, 2017. – 266 с.

20. Яжборовская, И.С. Россия и Польша. Синдром войны 1920 г. / И.С. Яжборовская, В.С. Парсаданова. – М.: Академия, 2005. – 403 с.

**УДК 94(476)**

# ПЫТАННЕ АБ МЕЖАХ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 1918–1921 гг.

***А.І. Лізуноў***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, lizunov_97@list.ru*

У дадзеным артыкуле даследуецца фарміраванне меж беларускай савецкай дзяржавы. Разглядаюцца падзеі абмеркавання меж прадстаўнікамі беларускага рэвалюцыйнага руху (бальшавікамі і эсэрамі) і бальшавіцкім кіраўніцтвам. Нададзена ўвага ўнутрыпалітычным канфліктам, якія былі ўзніклі на хвалі прыняцця рашэнняў па пагранічных пытаннях у 1917–1921 гг.

***Ключавыя словы:*** *ССРБ; дзяржаўная мяжа; Заходняя камуна; плебісцыт; Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў.*

## ВОПРОС О ГРАНИЦАХ СОВЕТСКОЙ БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ 1918–1921 гг.

***А.И. Лизунов***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости 4, 220030, г. Минск, Беларусь, lizunov_97@list.ru*

В статье исследуется формирование границ советской белорусской государственности. Рассмотрены события формирования границ представителями белорусского революционного движения (большевиков и эсеров) и большевистского руководства. Также учитываются те внутриполитические конфликты, которые возникли на волне принятия решения пограничного вопроса в 1917–1921 гг.

***Ключевые слова:*** *ССРБ; Западная коммуна; плебисцит; Белорусская партия социалистов-революционеров.*

## THE ISSUE OF THE BORDERS OF SOVIET BELARUS

***A. Lizunou***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Ave. 4, 220030, Minsk, Belarus, lizunov_97@list.ru*

This article examines the formation of the borders of the Soviet Belarusian statehood. The events of the border review by the representatives of the Belarusian revolutionary movement (Bolsheviks and Socialist Revolutionaries) and the Bolshevik leadership are considered. Also, those domestic political conflicts which were caused on a wave of decision-making of a frontier question in 1917–1921.

***Keywords:*** *SSRB; Western Commune; plebiscite; Belarusian Party of Socialist Revolutionaries.*

У перыяд 1917–1921 гг., падчас ліхалецця, якое было выклікана Першай сусветнай вайной, дзвюма рэвалюцыямі, Польска-савецкай вайной на тэрыторыі Беларусі на розных ідэалагічных глебах рабіліся спробы стварэння беларускай дзяржавы. Савецкая дзяржаўнасць, у адрозненні ад Беларускай Народнай Рэспублікі, змагла замацавацца на беларускіх абшарах. Але як і кожнай дзяржаве, Савецкай Беларусі было патрэбна вызначыцца наконт меж сваёй тэрыторыі.

Упершыню пытанне аб беларускай савецкай дзяржаўнасці і межах паўстала суадносна з першым абвяшчэннем ССРБ. Увесь 1918 г. дадзенае пытанне ўносіла разлад у працу Белнацкама і Аблвыканкамзаха. Белнацкам на чале з Д.Ф. Жылуновічам настойваў на стварэнні беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. З гэтым не пагаджалася кіраўніцтва Аблвыканкамзаха на чале з А.Ф. Мясніковым. Прадстаўнікі Паўночна-Заходняга Камітэта і Аблвыканкамзаха расцэньвалі ідэі Белнацкама як праявы дробнабуржуазнага сепаратызму і нацыяналізму. У іх поглядах змешваліся адразу некалькі ідэалагічных кірункаў, якія не дазвалялі ім прыняць думку аб змене дзяржаўнага статусу Беларусі: заходнерусізм, марксісцкае ўяўленне аб непатрэбнасці нацый. Увогуле, А.Ф. Мяснікоў адзначаў, што стварэнне любой нацыянальнай дзяржаўнасці замінае справе сусветнай рэвалюцыі [4, с. 145].

Аблвыканкамзах ігнараваў нацыянальныя прагненні не толькі беларусаў, але і латышоў, літоўцаў, разлічваючы на захаванне Заходняй вобласці і ператварэнне яе на Заходнюю камуну. На думку А.Ф. Мяснікова, уся Савецкая Расія павінна была складацца з такіх тэрытарыяльных адзінак. Таксама, Аблвыканкамзах ціснуў на Белнацкам, зачыняючы нацыянальныя ўстановы. Акрамя Аблвыканкамзаха, часткова і прадстаўнікі Белнацкама былі супраць ідэі аўтаномнасці Беларусі. Прадстаўнікі Белнацкама і беларускіх секцый РКП(б) ад Віцебскай, Смаленскай і Магілёўскай губерняў адмаўлялі ідэі самастойнасці або аўтаноміі, разлічваючы на захаванне Заходняй вобласці як адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкі ў складзе РСФСР.

21–23 снежня 1918 года Д.Ф. Жылуновіч з прыхільнікамі правёў у Маскве Канферэнцыю беларускіх секцый РКП(б). На ёй было пастаноўлена стварыць Часовы Работніцка-Сялянскі Урад Беларусі і Цэнтральнае Бюро беларускіх Секцый на чале з Д.Ф. Жылуновічам. А.Ф. Мяснікоў ставіўся да гэтых падзей максімальна адмоўна. Высветлена, што А.Ф. Мяснікоў меў некалькі размоў па прамой сувязі з наркамам па справах нацыянальнасцей І.В. Сталіным, у якіх даказваў неабходнасць арыштаваць Д.Ф. Жылуновіча і ўсіх удзельнікаў канферэнцыі як “контррэвалюцыянераў”. Але І.В. Сталін нічога тады не змог адказаць, бо 24-га снежня дзеянні Канферэнцыі былі разгледжаны ЦК РКП(б) [1, с. 17].

Вынік гэтага разгляду быў нестаноўчы для А.Ф. Мяснікова. У размове А.Ф. Мяснікова і І.В. Сталіна 26 снежня 1918 г., І.В. Сталін паведаміў, што ЦК вырашыла "пайсці насустрач" беларускім таварышам і згадзілася стварыць беларускую савецкую дзяржаву. І.В. Сталін запэўніў А.Ф. Мяснікова, што абмеркаванню гэта пытанне ўжо не падлягае, беларуская дзяржава будзе складацца з Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў. У дзяржаўным плане гэта будзе тая самая Заходняя камуна, але "з невялікімі канструкцыйнымі зменамі". Варта адзначыць, што А.Ф. Мяснікоў у адказ згаджаўся з усім, а першым пытаннем яго было "Хто гэтыя беларускія таварышы?". На наступны дзень, на асабістай нарадзе І.В. Сталіна і А.Ф. Мяснікова ў Маскве былі канчаткова вызначаны пытанні тэрыторыі, ураду і паўнамоцтваў Савецкай Беларусі. Тэрыторыя ССРБ, згодна дадзенаму рашэнню была наступная: Мінска, Магілёўская, Гродзенская, Віцебская і Смаленская губерні [2, с. 9].

Але нягледзячы на стварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове, канфлікт вакол беларускай дзяржаўнасці не спыняўся. У хуткім часе Савецкі ўрад пачаў прасоўваць план аб'яднання Літвы і Беларусі, з паслядоўным адсячэннем ад Беларусі Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў. 16 студзеня 1919 г. Я.М. Свярдлоў на пасяджэнні ЦК РКП(б) згадзіўся з дадзенай прапазіцыяй, якую агучваў наркам фінансаў, які зрабіў заяву, што існаванне ССРБ у дадзеных межах з'яўляецца спусташальным. Мэтазгодна аб'яднаць савецкія ўрады Беларусі і Літвы. Для адсячэння Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў варта было правесці мясцовы павятовыя і губернскія партканферэнцыі [4, с. 149–150].

Дадзеныя захады бальшавіцкага цэнтру былі сустрэты нестаноўча як наваствораным урадам ССРБ, так і мясцовымі беларускімі камуністамі. Ноты пратэсту, якія адсылалі Д.Ф. Жылуновіч і А.Р. Чарвякоў Я.М. Свярдлову і І.В. Сталіну адказу не мелі. Таксама пэўных наступстваў з боку Масквы не мела і складанне паўнамоцтваў беларускімі наркамамі Ф.Г. Шантырам, Я.Л. Дылай і У.С. Фальскім. У шэрагу паветаў вышэйазначаных губерняў прыходзілася праводзіць партканферэнцыі па некалькі разоў, паколькі мясцовыя камуністы ўпарта адмаўляліся пагаджацца з прысланым зверху тэзісам аб выхадзе са складу ССРБ і пераходзе ў склад РСФСР. Так, Невельскі, Себежскі,

Раслаўльскі і Драгабужскі паветы не змаглі згадзіцца выйсці са складу ССРБ і былі выведзены загадам. У Магілёўскай губерні на губернскую канферэнцыю прыехалі прадстаўнікі толькі ад Клімавіцкага, Чавускага і Аршанскага паветаў, якія наўпрост згадзіліся з дасланай зверху пастановай перайсці ў склад Савецкай Расіі. Прадстаўнікі ад астатніх паветаў наўпрост праігнаравалі губернскую канферэнцыю. У Віцебскай і Смаленскай губернях мясцовыя камуністы спрабавалі зацягнуць дадзены працэс. Такім чынам, ад ССРБ засталіся Мінская і Гродзенская губерні, якія ў хуткім часе былі зліты ў сумесную дзяржаву з Савецкай Літвой – ЛітБел [4, с. 153].

Гэта не задаволіла і саюзныя бальшавікам сілы, у прыватнасці беларускіх эсэраў. Як адзначаў Савет Абароны Літвы і Беларусі на тэрыторыі беларускай часткі ЛітБелу, паўсюдна адзначаліся праявы агітацыі за незалежную Беларусь і падбухторванне мясцовага насельніцтва на ўзброеныя антысавецкія дзеянні. У шэрагу валасцей паветаў Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў нават адзначаны сялянскія сходы і мітынгі на чале з эсэрамі, якія прапагандавалі ідэі супраціву савецкай уладзе [6, с. 16].

Наступны раз пытанне аб межах Савецкай Беларусі паўстала падчас другога абвяшчэння дзяржаўнасці на савецкай аснове. У гэтым пытанні сутыкнуліся ўяўленні бальшавікоў і савецкіх эсэраў. Распрацоўка беларускага савецкага дзяржаўнага праекту пачалася адразу пасля заняцця Рабоча-сялянскай Чырвонай арміяй Мінску ў 1920 г.

Была створана адпаведная камісія з прадстаўнікоў эсэраў, беларускіх бальшавікоў (на чале з А.Р. Чарвяковым), бальшавікоў (В.Р. Кнорын), Беларускай камуністычнай арганізацыі (на чале з У.М. Ігнатоўскім). Мэтай беларускіх арганізацый было абмеркаванне і аднаўленне беларускай дзяржавы ў этнічных межах на савецкай аснове. В.Р. Кнорын меў намер падчас пасяджэнняў камісіі стварыць умовы да інтэграцыі беларускіх эсэраў і БКА ў КП(б)Б. На пасяджэннях у ліпені 1920 г. абмяркоўваліся межы і дзяржаўна-палітычны лад Беларусі. На кожным з пасяджэнняў выяўлялася, што беларускія эсэры і бальшавіцкія сілы (групы А.Р. Чарвякова і У.М. Ігнатоўскага стаялі на пазіцыях пагаднення з бальшавіцкім цэнтрам у асобе Кнорына) маюць абсалютна процілеглыя погляды на кожнае з пытанняў [3, с. 19].

У пытанні наконт меж ізноў узніклі спрэчкі. Беларускія эсэры на чале з Я.К. Бялькевічам і Я.А. Мамонькам упарта адстойвалі ідэю абвяшчэння Савецкай Беларусі менавіта ў этнічных межах. У якасці сaступкі яны пагаджаліся на межы ССРБ, якія былі абвешчаны 1 студзеня 1919 г. У адказ на гэта В.Р. Кнорын зрабіў заяву аб тым, што Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні ніколі больш не будуць у складзе Беларусі. Увогуле, В.Р. Кнорын заявіў, што ўваходжанне Смаленшчыны, Магілёўшчыны і Віцебшчыны ў склад Савецкай Беларусі падчас першага абвяшчэння, з’яўлялася памылкай, з-за памылак у вызначэнні этнічных меж Беларусі: “Ніякіх беларусаў у Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерніі не жыве і ніколі не жыло, там жывуць выключна рускія людзі” [4, с. 156].

Дамовіцца з бальшавіцкім прадстаўніцтвам не атрымалася, бо В.Р. Кнорын не згаджаўся ісці на саступкі беларускім эсэрам. Увогуле іх дзейнасць ацэньвалася як нацыяналістычная і дробнабуржуазная. З-за няўзгодненасці пазіцый, канфлікт застаўся наўпрост нявырашаным. Дэлегацыя беларускіх эсэраў адмовілася і ад аб’яднання з беларускімі бальшавікамі, і ад падпісання Дэкларацыі аб другім абвяшчэнні БССР. Як вынік, на абвяшчэнні ССРБ 31 ліпеня 1920 г. А.Я. Мамонька зрабіў заяву аб тым, што беларускія эсэры будуць працягваць дапамагаць беларускаму савецкаму ўраду, але ў палітычным сэнсе будуць працягваць дзейнічаць самастойна, згодна сваім палітычным меркаванням [5, с. 14].

На наступны дзень ЦК КП(б)ЛіБ разарваў усе адносіны з БПСР, сябры БПСР падлягалі арышту. Мінскі губернскі камітэт КП(б)ЛіБ цалкам ухваліў рашэнне аб правільнасці пазіцыі бальшавіцкай партыі і неабходнасці ліквідаваць усе арганізацыі беларускіх эсэраў. Даволі вялікая частка членаў БПСР была ў савецкіх структурах, і яна стала ўспрымацца, як сведчаць справаздачы партыйнай камісіі, як сабатажнікі і небяспечныя элементы. Такая характарыстыка відавочна адлюстроўвала ўстаноўку на выцісканне беларускіх эсэраў з усіх органаў і савецкіх структур [5, с. 16-17].

Яскравым доказам дадзеных слоў з’яўляюцца падзеі, якія разгарнуліся ў лістападзе – снежні 1920 г., калі ўсе кіруючыя пасады ў Ігуменскім павеце занялі беларускія эсэры на чале з Карэшыным. Эсэры ў органах дзейнічалі згодная са сваёй партыйнай пазіцыяй, прыкрываючыся фіктыўным выкананнем бальшавіцкіх загадаў.

Кіраўнікі вайсковага і эканамічнага аддзелаў увогуле цалкам сабатавалі рашэнні вышэйстаячых органаў з ведама Карэшына. Мабілізацыя і харчразвёрстка ў Ігуменскім павеце была сарвана цалкам. Па павеце вольна гулялі агітатары эсэраў, якія вялі прапаганду наконт правядзення рэферэндуму аб дзяржаўным статусе Беларусі. І такія з'явы былі практычна ў кожным этнічным беларускім павеце, які застаўся на той момант на савецкім баку [5, с. 7].

Эсэры ў няўзброеным палітычным змаганні ў той момант выступалі за правядзенне плебісцыту, на што бальшавіцкія ўлады не маглі згадзіцца ні на якіх умовах. Эсэры бачылі падтрымку сваёй ідэі ў англійскай дыпламатыі, якая кансультатыўна прапанавала на мірных перамовах Польшчы і Савецкай Расіі стварыць Беларускую дзяржаву ў этнічных межах, адвесці ад гэтых меж войскі на 25 вёрст і правесці на дадзеным абшары рэферэндум аб самавызначэнні. Але ні савецкі, ні польскі бакі не маглі з гэтым пагадзіцца. Ідэі эсэраў таго часу не маглі стаць рэчаіснасцю. [4]

Пытанне аб тэрыторыі Савецкай Беларусі было канчаткова вырашана бальшавікамі і зацверджана паводле Рыжскай мірнай дамовы. Як адзначаў В.Р. Кнорын, на пасяджэннях савецкіх органаў улады, яшчэ час ад часу гучалі прапановы А.Р. Чарвякова аб вяртанні беларускіх зямель. Але ўсе яны разбіваліся аб пазіцыю бальшавіцкага цэнтру. Тым больш мясцовыя бальшавікі лічылі такія захады небяспечнымі па некалькіх прычынах. Па-першае, гэтым маглі скарыстацца беларускія эсэры, якія засталіся на савецкім баку для падрыўной дзейнасці. Па-другое, на думку В.Р. Кнорына і бальшавікоў, вяртанне беларускіх этнічных зямель у склад БССР можа даць надзею беларускім узброеным фарміраванням (у першую чаргу С.Н. Булак-Балаховічу, які ўжо вёў сваю вайну) на паўтарэнне авантуры Л. Жалігоўскага, але ўжо выключна ў адносінах Савецкай Беларусі.

Такім чынам, на працягу 1917–1921 гг. уяўленне аб межах Савецкай Беларусі ў асяроддзі савецкіх уладаў перажыло шэраг трансфармацый. Ад Савецкай Беларусі амаль у этнічных межах да шасці паветаў. Прычыны, якімі карысталіся бальшавіцкія кіраўнікі, былі розныя: эканамічныя (адсутнасць эканамічных сувязей паміж усходнімі губернямі і заходняй), знешнепалітычныя (магчымасць скарыстання тэрыторыі БССР для нападу знешніх сіл), а таксама ўласныя погляды дзеячоў бальшавіцкага руху (А.Ф. Мяснікоў,

В.Р. Кнорын). Таксама варта адзначыць, што рашэнні аб межах Савецкай Беларусі прымаліся ў партыйным кіраўніцтве РКП(б), уплыву на гэты працэс прадстаўнікі беларускага рэвалюцыйнага руху не мелі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛІМ) Ф. 340. Воп. 3. Спр. 86.
2. БДАМЛІМ Ф. 340. Воп. 3. Спр. 48.
3. БДАМЛІМ Ф. 340. Воп. 3. Спр. 77.
4. Нарыс беларускай дзяржаўнасці:XX стагоддзе / М.П. Касцюк і інш. Мінск: Беларуская навука 2008.
5. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Ф.4п. Оп. 2. Д. 2.
6. НАРБ. Ф. 664. Оп. 1. Д. 1.
7. НАРБ. Ф. 325. Оп. 1. Д. 8.



**УДК 94(47).084.3**


# РИЖСКИЙ МИР 1921 г.: ПЕРВЫЙ ОПЫТ ВНЕШНЕПОЛИТИЧЕСКОГО СОТРУДНИЧЕСТВА СОВЕТСКИХ РЕСПУБЛИК РОССИИ, БЕЛАРУСИ И УКРАИНЫ


***А.И. Остапенко***

*Московский государственный университет имени М.В. Ломоносова, Российская Федерация, 119191, г. Москва, Ленинские горы, 1, ostap-man@mail.ru*



В статье рассматривается, как в условиях гражданской войны и интервенции складывалась общая позиция советских республик России, Беларуси и Украины по отношению к Польше. Первоначально совместные дипломатические акции выражались в общих заявлениях от имени трех советских правительств и совместных нотах, направлявшихся внешнеполитическими ведомствами республик в МИД Польши. В дальнейшем на мирных переговорах с Польской республикой в Минске и Риге единство проявилось в том, что общие интересы отстаивала совместная делегация от РСФСР и Советской Украины, располагавшая также полномочиями, переданными ей Советской Белоруссией. Итогом согласованной внешнеполитической деятельности РСФСР, БССР и УССР по отношению к Польше явился подписанный 18 марта 1921 года Рижский мир, по которому три советские республики получили официальное признание со стороны Варшавы.



***Ключевые слова:*** *РСФСР; БССР; УССР; Рижский мир.*